# Першыя святыні

*Калнін, В.В. Першыя святыні / В.В. Калнін // Калнін, В.В. Гродна ў дыялогу стагоддзяў: альбом / В.В. Калнін. - Мінск: Кавалер, 2008. - С. 52-69.*

Ніжэй ад Старога моста па цячэнні Нёмана, за ярам рэчкі Гараднічанкі зачапілася за высокі бераг малая цэркаўка, напалову мураваная, а напалову драўляная. Тут больш як паўтара стагоддзя таму паважны Нёман праявіў свой нораў - у высокую веснавую ваду паўднёвая частка Барысаглебскай царквы на Каложы абвалілася. Умацаваная ля падмуркаў, ацалелая частка царквы і зараз служыць людзям.

Хоць моцна пацярпелая, царква святых Барыса і Глеба вабіць вока незвычайным убраннем, складзеным з простых элементаў - тонкай цэглы-плінфы, абчэсаных на гладка валуноў розных адценняў і вясёлкавых маёлікавых уставак, выкладзеных у выглядзе крыжыкаў. Унутры ў сцены ўмураваны галаснікі-рэзанатары - словы малітвы лагодна расцякаюцца над галовамі прысутных.

Каложскую царкву, якой ужо больш за восем стагоддзяў, слушна называюць першай святыняй горада. Але ёсць ў Гродне і яшчэ старэйшая пабудова - так званая Ніжняя царква. Самой пабудовы ўжо няма, засталіся вялікія парозненыя фрагменты. Яны былі раскрыты на двары Старога замка ў трыццатыя гады мінулага стагоддзя. Зараз рэшткі Ніжняй царквы накрыты павільёнам. Царква таксама, як і Каложская, пабудавана ў 12-м стагоддзі і мела падобную канструкцыю, але хутка ў выніку пажару разбурылася. Пазней пагарэлую частку замкавага двара засыпалі, а над былой царквой пабудавалі невялічкі мураваны храм - Верхнюю царкву. Яна ўжо мела іншы характар архітэктуры - гатычны. Зараз і ад яе засталіся толькі фрагменты.



*Сцены каложскай царквы - слаўныя і пакутныя*

У іншым месцы, па-за межамі Старога замка, дваццаць пяць год таму знайшлася яшчэ адна царква, Прачысценская. Пра яе нешта ведалі, але ўсё роўна з’явілася яна нечакана. Ішла рэстаўрацыя былога базыльянскага манастыра, прызначанага пад музей гісторыі рэлігіі. Зараз тут знаходзіцца Багародзіцкі манастыр. Ад старой царквы засталося яшчэ менш, як ад Ніжняй на замку, - толькі падмуркі і дробныя фрагменты. Калі пачалі па- раўноўваць тры царквы - Каложскую, Ніжнюю і Прачысценскую, - то апошняя аказалася “старэйшай з сёстраў”, збудаванай у тым жа дванаццатым стагоддзі, але крыху раней. Яна была меншай па памерах і прасцейшай па форме. Агляд усіх трох цэркваў паказваў, як у Гародні часоў Кіеўскай Русі паступова і ўпэўнена стваралася арыгінальная школа храмавага дойлідства.

*Ніжняя царква - папярэдніца Каложскай*



Зноў вернемся да Барысаглебскай на Каложы. Ад храма 12-га стагоддзя да нас дайшла не больш чым адна трэць, ды і тая не ў першасным выглядзе. За доўгі перыяд існавання царква перажыла не адно разбурэнне і не адну пераробку. Сляды пакутаў добра відаць - калі што на сценах “латалі”, то ўжывалі таўсцейшую цэглу, а не тонкую плінфу, з якой складзена аснова.

Пасля абрушэння ў Нёман паўднёвай паловы царквы яна доўга стаяла закінутай. Толькі ў 1899 годзе зрабілі падпорную сцяну і пляцоўку вакол храма. Потым на подступах да схілу ўмацавалі самы бераг ракі. Зараз гэта месца выглядае даволі рамантычна: над самай прорвай вісіць маленечкае збудаванне, напалову драўлянае, і над ім - царкоўная макаўка з залатым крыжыкам, як ратавальны якар, зачэплены за нябёсы. Блізу царквы міжволі стрымліваецца дыханне ды прамільгне думка: а калі падпора не вытрымае?

Часам такі страх прыносіць карысныя вынікі. Так здарылася, што і мне давялося неяк “ратаваць” святыню. Было гэта напрыканцы 70-х гадоў, калі беларускі пісьменнік Аляксей Карпюк быў дырэктарам Музея гісторыі рэлігіі. Каложа лічылася адным з экспанатаў музея. Аднойчы Карпюк пачаў закідваць сталічнае кіраўніцтва тэлеграмамі: “Нёман падмывае берагі, Каложа валіцца!”. Прыслалі мяне. Вада сапраўды высокая, але царква на месцы. Што рабіць? Тады ўспомнілася гісторыя з Петрапаўлаўскім саборам у Пецярбургу з часоў імператрыцы Кацярыны II.

Афіцэр аховы Зімняга палаца далажыў, што шпіль Петрапаўлаўкі ды і ўвесь сабор нахіліліся. Праверыць сітуацыю накіравалі галоўнага прыдворнага механіка Кулібіна. Пакуль ніякага адхілення не назіралася. Дзеля большай пэўнасці ён выйшаў на лёд Нявы і пачаў правяраць вертыкальнасць сабора адвесамі з розных месцаў. Вынік той жа - усё на месцы. У роспачы зайшоў Кулібін да дзяжурнага афіцэра і раптам заўважыў з вакна нахілены сабор. Стала ясна: пакрывілася каравульня. Яе і паправілі.

Кабінет і вокны паважанага пісьменніка былі ў парадку. Але сітуацыю трэба неяк вырашаць. Першае, што прыйшло ў галаву, - неабходна наладзіць сталы кантроль. Разам з рабочымі ўсталявалі на расколінах цэментныя маякі. Якое ж потым было маё здзіўленне з радасці музейных супрацоўнікаў ад такога “ратавання”! Штодня забягалі яны на Ка ложу і аглядалі маякі - нейкія валасяныя трэшчыны з’явіліся, але не раслі. Супрацоўнікі адыходзілі з палёгкай: царква не рухаецца! Магчыма, дагэтуль стаяць тыя засцерагальныя знакі з датай іх устаноўкі - на жаль, я даўно там не быў.



*Каложская царква знутры*

Некалькі гадоў таму па Каложскай царкве былі праведзены грунтоўныя інжынерныя даследаванні. У выніку падножжа схілу, на

якім стаіць царква, дадаткова замацавана бетонным масівам на сталёвых цяжах. Царква такім чынам набыла “шпількі” і стала падобнай на сучасных модніц. Але гэта, як бы мовіць, тэхнічнае пытанне.

Былі і ёсць розныя прапановы па яе аднаўленні, але дагэтуль няма (і быць не можа) адзінай канцэпцыі па колішнім вонкавым выглядзе. Дзякуй Богу, што яны не здзейсніліся. Дай Божа, каб усё, што робіцца вакол Каложы, пайшло на сапраўднае захаванне старажытнага храма, дзе кожны камень, кожная рысачка маюць святую вартасць.